


## Дзейнічайце разам з намі для захавання прыроды Беларусі!



Экспедыцыя Захавальнікаў для выяўлення пагроз ТВП

## Мы – Захавальнікі ТВП "Казьяны"!



Уладзімір Іваноўскі

Калі Вы жывяце каля Казьянскіх балот ці маеце магчымасць наведваць іх, Вы можаце стаць Захавальнікам ТВП "Казьяны" і дапамагчы зберагчы яе для нашчадкаў.

Удзельнічайце ў захаванні ТВП "Казьяны", паведамляйце пра пагрозы і свае назіранні супрацоўнікам АПБ, заказніка, прыродаахоўных інспекцый.

## Як далучыцца да нас?

**Заходзьце на старонку**

**www.iba.ptushki.org**

**або тэлефануйце:**

**8 (017) 263-06-13**

**ГА "Ахова птушак Бацькаўшчыны"**

8 (017) 263-06-13, www.ptushki.org
8 (029) 223-06-13, info@ptushki.org
8 (029) 101-68-87 www.vk.com.ptushki
www.fb.com/APB.BirdLife.Belarus

**Заказнік "Казьянскі"**
г. п. Шуміліна

8 (02130) 4-16-41
zakaznikshum@mail.ru

Здымкі: В. Кавалёнак, Дз. Кіцель, А. Лычаўка , С. Плыткевіч, У. Пушкін, F. Carlsen

Праект DCI-NSAPVD/2012/292081 "Прырода важна для ўсіх. Умацаванне аховы прыроды праз развіццё лідэрства і ўдзел мясцовага насельніцтва ў працэсе прыняцця рашэнняў на мясцовым узроўні" рэалізуецца ГА "Ахова птушак Бацькаўшчыны" пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага Саюза. За змест выдання адказвае ГА "Ахова птушак Бацькаўшчыны"

ООО «РИФТУР ПРИНТ» Свидетельство о ГРИИРПИ № 1/284 от 09.04.2014 г. Типография УП «Джи энд Ди» Свидетельство о ГРИИРПИ № 2/36 от 13.01.2014 г. Тираж 2000 экз. Заказ 411

Грамадская арганізацыя
**"Ахова птушак Бацькаўшчыны"**
www.ptushki.org

Тэрыторыя, важная для птушак

# КАЗЬЯНЫ



Праект фінансуецца ЕС



Арол-маркут

## Што такое ТВП?

Эфектыўным метадам аховы многіх відаў жывёл і раслін з'яўляецца захаванне прыродных тэрыторый, неабходных для іх існавання. Адзін з падыходаў – гэта выдзяленне ў адпаведнасці з пэўнымі крытэрыямі Тэрыторый, важных для птушак (ТВП), якія забяспечваюць выжыванне папуляцый большасці відаў птушак. Гэта месцы гнездавання, зімоўкі ці міграцыйныя шляхі тых відаў птушак, якія маюць неспрыяльны ахоўны статус або знаходзяцца пад пагрозай знікнення.

Сусветная праграма ТВП ахоплівае 200 краін, больш за 12 000 тэрыторый, з якіх 51 знаходзіцца ў Беларусі.

ТВП "Казьяны" – складаны мазаічны комплекс буйных масіваў верхавых і пераходных балот, адметны таксама адкрытымі нізіннымі балотамі. Казьяны маюць высокі статус водна-балотнага ўгоддзя міжнароднага значэння (Рамсарская тэрыторыя).

**Карта Тэрыторый, важных для птушак Беларусі**




## Цікавыя факты пра ТВП "Казьяны"

1 Цэнтральную частку аднайменнага заказніка і ТВП займае Обальскае балота. Гэта адно з найбольш значных верхавых балот для захавання біяразнастайнасці Беларусі. Яго асаблівасць – унікальны градава-азёрны комплекс.

2 Амаль усе чырванакніжныя віды драпежных птушак і кулікоў гняздуюцца тут. Адметны факт – гнездаванне арла-маркута (у Беларусі гняздуецца ўсяго толькі 4–6 пар!).

3 На паўднёвы захад ад воз. Расалай на малой плошчы налічваецца больш за 100 невялічкіх азёр дыяметрам 20–50 м, якія ўтвараюць "марсіянскі краявід".



Сокал-дрымлюк

4 Пашыраны арол-вужаед, скапа, сокал дрымлюк, сокал кабец. Таксама гняздуюцца віды, тыповыя для верхавых балот: сярэдні кулён, залацістая сеўка, кулік-селянец.



Сярэдні кулён

5 Шызыя чайкі ўтварылі калонію на соснах, тады як звычайна гэты від гняздуецца на зямлі. Такі новы спосаб ратуе птушак ад разбурэння гнёздаў наземнымі драпежнікамі і людзьмі.

6 З раслін адметная марошка прысадзістая, якая тут нават пладаносіць, што нетыпова для ўмоў Беларусі.



Марошка



Глушэц

7 Тэрыторыя заказніка прывабная для курыных птушак – тут выяўлены шматлікія токі глушцоў і цецерукоў.

## Што пагражае ТВП "Казьяны"?

- Турбаванне птушак у час веснавога збору журавін (красавік – май).
- Спусташэнне гнёзд, зробленых на зямлі, асабліва па берагах азёр, у асноўным янотападобнымі сабакамі і гора-рыбаловамі.



Янотападобны сабака

*Пазбягайце наведваць балота вясной, асабліва мясціны каля азёр! І ні ў якім разе не хадзіце туды з сабакам!*

- Пажары ў сфагнавых сасняках.
- Малая колькасць стараўзроставых дрэў па берагах балот, якія маглі б вытрымаць цяжар гнязда буйной драпежнай птушкі. (Але дзякуючы намаганням арнітолагаў за некалькі дзесяцігоддзяў каля 30 птушанят з'явілася на свет у штучных гнёздах.)

